знаходзіліся, не бачныя удзельнікам, разнастайныя призы. Разам з каштоўнымі знаходзіліся і жартоўныя: пляшка гарэлкі, рваны бот, нягодны хамут, кансервная банка, дзіравы тазік, маленькая плотачка, ці салёная цюлька і да т. п.

Гулец, заплаціўшы 20 грошаў, атрымліваў вуду і за адну хвіліну павінен быў выцягнуць выбраны паплавок. Ну, а які прыз — гэта каму як пашанцуе.

Як сведчыць інфарматар, гэтая латарэя мела вялікі поспех. За адну хвіліну надзвычай рэдка камусьці ўдавалася здабыць прыз, што прымушала ахвотнікаў па некалькі разоў удзельнічаць у латарэя, а гэта — прамая матэрыяльная мэтазгоднасць правядзення гэтага гандлёва-гульнёвага дзеяння.

Разам з тым, латарэя-рыбалка з'яўлялася сапраўдным відовішчам, на якое збіралася шмат людзей, якія рабілі разнастайныя парады гульцам, радаваліся іх поспехам, ці жартавалі з іх няўдалай рыбалкі.

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісаў П. А. Гуд у 1979 г. у Століне Брэсцкай вобласці ад М. І. Мельніка (1929 г. н.).

## Сельскагаспадарчая латарэя.

На Століскіх кірмашах да Вялікай Айчыннай вайны вялізарную цікавасцьудзельнікаў штогодніх святочных таргоў выклікала бяспроігрышная сельскагаспадарчая латарэя. Тут разыгрываліся каштоўныя прызы (бычкі, парсючкі, бараны, пеўні, куры, гусі) і суцяшальныя (морква, бульба, яблыкі, слівы, грушы і да т.п.).

Латарэйную пляцоўку агароджвалі плотам, рабілі ўваходную браму, каля якой ставілі стол з латарэйным барабанам. Непасрэдна на пляцоўцы рабілі выстаўку тых тавараў, якія разыгрываліся ў латарэі. Асобна стаялі хатнія жывёлы, птушкі, ляжалі горкі гародніны, садавіны. А гледачы ціснуліся да плота, разглядаючы, што там яшчэ засталося, ці варта пайграць у латарэю, паспытаць сваё шчасце, удачу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Удзельнік плаціў 20 грошаў** і апускаў руку ў вялізны латарэйны **барабан, які перад** гэтым сам раскручваў. **Выцягваў раскручаную паперку**-білецік, разгортваў яе і **бачыў напісаны на ім прыз:** ці бычок, ці морква – як **пашанцуе**...

**Свой прыз гулец** павінен быў забіраць з латарэйнай **пляцоўцы. Часта гэта** ператваралася ў цэлае відовішча, калі **"шчаслівец" ганяўся** па пляцоўцы а пеўнем, гусем ці баранам, што выклікала жывы водгук у прысутных і жаданне самім паўдзельнічаць у латарэі.

Сельскагаспадарчая латарэя, як паказвае практыка, заўсёды з'яўляецца адным з самых яскравых і запамінальных святочных дзеяняў, якое вызначаецца высокім эмацыянальным напалам і масавасцю ўдзелу.

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісаў П. А. Гуд у 1979 г. у Століне Брэсцкай вобласці ад М. І. Мельніка (1929 г. н.).

## *Латарэя-рулетка.*

Да Вялікай Айчыннай вайны на кірмашах Пружанскага і Івацэвічскага раёна Брэсцкай вобласці штогод ладзілі латарэю-рулетку, у якой разыгрывалі кандытарскія вырабы, ці разнастайныя рэчы. Канструкцыі гэтых латарэй у кожнай мясцовасці мелі свае адметныя асаблівасці.

Пружанская латарэя-рулетка ўяўляла сабой гарызантальны палутараметровы драўляны круглы шчыт, які круцілі па ходу сонца, ці наадварот. Па акружнасці шчыта змяшчаліся прызы. У цэнтры знаходзілася свабодна замацаваная драўляная рыба з загнутым цвіком у роце. Гулец плаціў грошы за ўдзел у латарэі, сам раскручваў шчыт у адзін бок, а рыбу — у другі, прычым загадзя ён клаў грошы каля выбранай ім рэчы. Калі па заканчэнні руху круга рыба чаплялася цвічком за цвік выбранай гульцом рэчы, то ён забіраў прыз і грошы, а калі не — то грошы пераходзілі ва ўласнасць гаспадара латарэі.
У Івацэвічскім раёне вертыкальны драўляны шчыт быў двухметровы. Па вялікаму знешняму кругу набівалася 8



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ